БИБЛИОТЕКА БГУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

16 лістапада 2009 года, № 19 (2012)



МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

## БДУ НА РАДЗІМЕ ГАЎДЗІ І ПІКАСА*

***Апошнім часам кантакты кіраўніцтва Белдзяржуніверсітэта з замежнымі калегамі, можна смела казаць, развіваюцца імкліва і з вялікай перспектывай – тым самым яны садзейнічаюць умацаванню аўтарытэту нашай ВНУ ў Еўропе. Пасля "заваявання" Апенін (шэраг пагадненняў у Італіі) БДУ асвойтаўся на Пірэнейскім паўвостраве.***



*На здымку (злева направа): прафесар Віктар Краснапрошын, прэзідэнт Каралеўскай акадэміі дактароў Хасэ Касахуан Гіберт, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і прэзідэнт Іспанскай акадэміі эканомікі і фінансаў Хайме Хіль Алуха*

У папярэднім нумары газеты мы паведамлялі пра абранне рэктара БДУ Сяргея Абламейкі ў адну з іспанскіх акадэмій. Па яго вяртанні сталі вядомыя дакладныя факты візіту. Такім чынам, 17 кастрычніка ў Барселоне яму ўрачыста ўручана пасведчанне і знак замежнага члена Каралеўскай акадэміі дактароў, самай уплывовай грамадскай навуковай арганізацыі Іспаніі. Яна была створана ў 1857 г., а ў 1989 г. кароль Хуан Карлас адзначыў яе ўласным прэстыжным тытулам. Сяргей Уладзіміравіч на сёння адзіны прадстаўнік Беларусі ў складзе гэтага паважанага супольніцтва, у якое, дарэчы, уваходзіць экс-прэзідэнт МАК Хуан Антоніо Самаранч, а ад Расіі – акадэмік РАН Юрый Жураўлёў.

Гэтым ганаровым званнем рэктар БДУ ўдастоены за ўнёсак у сусветную навуку ў галіне матэматыкі і інфарматыкі, таму што Сяргей Уладзіміравіч даўно і плённа супрацоўнічае з універсітэтамі Каталоніі і Мурсіі па лініі сваіх навуковых даследаванняў.

Тэма супрацоўніцтва стала асноўнай і ў цяперашні прыезд Сяргея Абламейкі на Пірэнеі. Ён правёў перамовы з прэзідэнтам Іспанскай акадэміі эканомікі і фінансаў, з нядаўняга часу ганаровым прафесарам нашага універсітэта, сеньёрам Хайме Хіль Алуха пры ўдзеле прафесара ФПМІ БДУ Віктара Краснапрошына. У выніку распрацаваны план правядзення на базе нашай ВНУ ў верасні 2010 г. Кангрэса па матэматычных метадах кіравання ў эканоміцы сумесна з Міжнароднай асацыяцыяй па менеджменце прадпрыемстваў (г. Мадрыд). Таксама была разгледжана магчымасць арганізацыі ў чэрвені 2011 г. сумеснай сесіі па эканамічных навуках БДУ, НАН Беларусі і Іспанскай акадэміі эканомікі і фінансаў.

Наступным пунктам праграмы стала наведванне 23–24 кастрычніка Аўтаномнага універсітэта Барселоны, дзе рэктар выступіў з дакладам у Цэнтры машыннага зроку АУБ, а таксама правёў перамовы з кіраўніцтвам цэнтра наконт супрацоўніцтва ў галіне інфармацыйных тэхналогій і навукова-інавацыйнай дзейнасці.

Сумесныя навуковыя праекты, а таксама магчымасці абмену аспірантамі былі абмеркаваны і з кіраўніцтвам Каталонскага політэхнічнага універсітэта. Сяргей Абламейка сустрэўся з рэктарам КПУ, пазнаёміўся з працай унікальнага суперкампутарнага цэнтра, аналаг якога плануецца стварыць у БДУ, і выступіў з дакладам у Інстытуце робатыкі і прамысловай інфарматыкі дадзенага універсітэта.

Завяршыўся візіт сустрэчай з кіраўніцтвам Універсітэта Равіра і Віргілі (г. Тарагона), на якой таксама былі абмеркаваны магчымасці двухбаковай кааперацыі.

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

* Барселона – радзіма славутага архітэктара Антоніо Гаудзі і сусветна вядомага мастака Пабла Пікаса.

Чытайце ў нумары:

НАШ КАВАЛАЧАК ЕЎРАПЕЙСКАГА ПІРАГА
Семінар Цэнтральнай еўрапейскай ініцыятывы заклікаў павысіць мабільнасць выкладчыкаў і студэнтаў
Стар. 2

ПРАЦЯГ ПАСЛЯ ВАЙНЫ
Гісторыі альма-матэр першага пасляваеннага пятнаццацігоддзя прысвечана кніга "Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1945–1961"
Стар. 3

ЭПІДЭМІЯ ГРЫПУ? БЕЗ ПАНІКІ!
Рэальная сітуацыя з грыпам і ВРВІ ў сталіцы і парады па іх прадухіленні з вуснаў спецыялістаў
Стар. 4

**ВУЧОНЫ САВЕТ**

На ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета Белдзяржуніверсітэта 26 лістапада ў будынку рэктарата будзе ўручаны дыплом ганаровага прафесара БДУ генеральнаму сакратару Міжнароднага тэлекамунікацыйнага саюза доктару Хамадун І. Турэ.

VIP–ДЫЯЛОГ

## У РЭЧЫШЧЫ "УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА"

***Добрай традыцыяй стала наведванне нашага універсітэта кіраўнікамі замежных міністэрстваў і ведамстваў. Дзякуючы гэтаму студэнты і выкладчыкі маюць магчымасць не толькі пазнаёміцца з палітыкамі, вучонымі і дзяржаўнымі дзеячамі, якія ствараюць сёння гісторыю, але і пагутарыць з імі.***



*На здымку: міністр замежных спраў Латвіі Марыс Рыекстыньш (злева) і першы прарэктар БДУ прафесар Міхаіл Жураўкоў*

Падобны дыялог адбыўся 3 лістапада на сустрэчы з міністрам замежных спраў Латвіі Марысам Рыекстыньшам. У межах афіцыйнага візіту ў нашу краіну ён выступіў з лекцыяй "Усходняе партнёрства як важны інструмент развіцця адносін паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю" і адказаў на пытанні. Высокага госця віталі першы прарэктар БДУ прафесар Міхаіл Жураўкоў і дэкан факультэта міжнародных адносін прафесар Віктар Шадурскі.

Наша рэспубліка, як вядома, у сакавіку гэтага года стала ўдзельнікам праграмы "Усходняе партнёрства", якая прадугледжвае эканамічную інтэграцыю і палітычнае збліжэнне ЕС з 6 дзяржавамі: Азербайджанам, Арменіяй, Беларуссю, Грузіяй, Малдовай і Украінай. Латвія – член Еўрапейскага саюза з 2004 г. Па словах Марыса Рыекстыньша, Рыга была актыўным прыхільнікам паўнапраўнага ўключэння Беларусі ў арбіту "Усходняга партнёрства". "І зараз вельмі важна, каб вашы эксперты абмяркоўвалі тактычныя праекты, у якіх яны зацікаўлены ў рамках гэтай ініцыятывы", – падкрэсліў міністр. Пры гэтым ён звярнуў увагу на неабходнасць супрацоўніцтва ва ўсіх галінах жыццядзейнасці людзей.

Латвійскі дыпламат канстатаваў, што адносіны Беларусі і Латвіі развіваюцца "так, як гэта і павінна быць паміж суседзямі", і выказаў упэўненасць у актывізацыі партнёрскіх сувязяў паміж ВНУ дзвюх краін.

Напачатку выступу Марыс Рыекстыньш прызнаўся, што хваляваўся перад сустрэчай з такой жывой і актыўнай аўдыторыяй, як студэнты. І хоць гутарка доўжылася каля гадзіны, думаецца, дыялог атрымаўся цікавым і карысным для абодвух бакоў.

***Даведка***

З 2003 г. былі падпісаныя дамовы аб супрацоўніцтве БДУ з Балтыйскай міжнароднай акадэміяй, Латвійскім і Даўгаўпілскім універсітэтамі.

**Ларыса ПЕТРАВЕЦ**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

МАРКЕТЫНГ

## ПРАЗ АДЛЕГЛАСЦІ

***БДУ 1 лістапада прыняў удзел у выставе-кірмашы "Адукацыя і кар'ера–2010. Гродзенскі рэгіён", якая праводзілася ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.***

У выставе-кірмашы ўдзельнічалі 33 навучальныя ўстановы РБ, сярод якіх 7 ВНУ Мінска, Гродна і Магілёва. На выставе пабывала больш за 8500 абітурыентаў, больш за 250 педагогаў і бацькоў.

Супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы, факультэта дауніверсітэцкай адукацыі і ІБМТ кансультавалі наведвальнікаў выставы – будучых абітурыентаў, іх бацькоў і супрацоўнікаў школ пра спецыяльнасці і кірункі падрыхтоўкі ў БДУ, факультэты і кафедры нашага універсітэта. У школы, ліцэі і гімназіі Гродзенскай вобласці былі перададзеныя інфармацыйныя матэрыялы пра факультэты і больш як 200 асобнікаў спецыяльнага выпуску газеты "Універсітэт".

***

***Адукацыйныя праграмы факультэтаў і інстытутаў БДУ былі прэзентаваны ў Турцыі на Міжнароднай адукацыйнай выставе "Fall 2009 Turkey Fair". Яна прайшла з 7 па 10 лістапада ў Стамбуле і Анкары.***

Нашу дэлегацыю складалі супрацоўнікі ўпраўлення міжнародных сувязяў і факультэта дауніверсітэцкай адукацыі. Па выніках заключаны пагадненні аб накіраванні ў БДУ на курсы рускай мовы грамадзян з Турцыі і краін Блізкага Усходу.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

НАВУКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Наш кавалачак еўрапейскага пірага

**_БДУ з'яўляецца нацыянальным каардынатарам Універсітэцкай сеткі Цэнтральнай еўрапейскай ініцыятывы (CEI). А значыць, тыя беларускія ВНУ, якія жадаюць наладзіць супрацоўніцтва з іншымі еўрапейскімі ВНУ і атрымаць на яго фінансаванне ад CEI, могуць звяртацца з усімі пытаннямі ў наш універсітэт. Пра развіццё супрацоўніцтва паміж ВНУ ў рамках Універсітэцкай сеткі CEI вялася гаворка на адмысловым інфармацыйна-метадычным семінары, які прайшоў 27 кастрычніка ў рэктараце БДУ._**

Універсітэцкая сетка з'яўляецца ўнёскам CEI ў вышэйшую адукацыю, які мусіць узмацніць супрацоўніцтва паміж ВНУ краін, што ўваходзяць у гэтую сетку. Зараз такіх краін 18, прытым толькі палова з іх уваходзіць у Еўразвяз. Прынцып, пакладзены ў аснову функцыянавання сеткі, – мабільнасць студэнтаў і выкладчыкаў. Гэтая мабільнасць абумоўлена ажыццяўленнем сумесных праграм (Joint Programmes, JPs) і падтрымліваецца фінансава. Сумесныя праграмы ўключаюць паслядыпломную падрыхтоўку (магістрантаў і аспірантаў, у еўрапейскім эквіваленце Master's courses, PhD programmes), летнія школы, семінары і майстэрні.

Ідэя ўтварэння сеткі ўзнікла падчас сустрэчы кіраўнікоў урада CEI ў Трыесце (лістапад 2001), фундатарскі блок быў распрацаваны на два гады пазней – і афіцыйна сетка пачала дзейнічаць у 2004 г.

### ПАТРАБАВАННІ

Каб выкладчыкі маглі атрымаць гранты, а магістранты і аспіранты – стыпендыі, трэба выканаць тры патрабаванні:

па-першае, сумесная праграма павінна быць сапраўды сумеснай: уключаць у выкананне прынамсі дзве ВНУ з розных краін-удзельніц CEI;

па-другое, праграмы мусяць адпавядаць адной з 6 сфер кааперацыі: Эканоміка, Інфраструктура і транспарт, Рэгіянальнае развіццё і урбаністычнае планаванне, Кіраванне грамадствам і кіраўнічыя мадэлі, Інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, Наваколле (Economics, Infrastructure and Transport, Regional Development and Urban Planning, Public Administration and Governance Models, ICT, Environment);

па-трэцяе, у межах праграмы мова навучання павінна быць англійскай.

### ХТО АТРЫМАЕ ПЕРШЫ

Перавагі ў размеркаванні грашовай дапамогі на выкананне праграм маюць краіны, якія не ўваходзяць у Еўразвяз. Таксама прыярытэт пры разглядзе маюць расчэпленыя сумесныя праграмы (Split Joint Programmes), якія прадугледжваюць, напрыклад, правядзенне курсаў у розных ВНУ, а не ў адной.

### ШТО ДАЮЦЬ

Дасюль CEI паспела падтрымаць больш за сто універсітэтаў краін-удзельніц. Гэтая падтрымка вылілася ў прыблізна 600 стыпендый для навучэнцаў і грантаў для выкладчыкаў на суму каля 920.000 еўра.

У асноўным грошы пакрываюць транспартныя выдаткі (прыезд у краіну, дзе ажыццяўляецца частка сумеснай праграмы), пражыванне ў іншай краіне на час выканання праграмы, аплата выкладчыкам іх працы ў іншай краіне. Па запыце выканаўцаў праграм магчымыя і іншыя віды падтрымкі, прыкладам, пакрыццё арганізацыйных выдаткаў, плата за навучанне – так, дзякуючы падтрымцы CEI навучэнец з венгерскай ВНУ атрымаў магчымасць скончыць поўны курс аспірантуры (PhD) у італьянскай ВНУ, прытым плата за навучанне складала 15.000 еўра. Як патлумачыла падчас семінара прадстаўнік Выканаўчага сакратарыята CEI Танія Пібернік, магчымыя розныя варыянты, галоўнае – апісаць неабходныя выдаткі і абгрунтаваць іх неабходнасць пры падачы заяўкі на атрыманне фінансавання з фондаў CEI.






*Танія Пібернік падчас прэзентацыі Універсітэцкай сеткі CEI*

### ПЕРШЫЯ СЫТЫЯ ЛАСТАЎКІ

Беларусь брала ўдзел у трох праграмах, фінансаваных CEI. У 2005–2006 нав.г. нашы студэнты ўдзельнічалі ў працы міжнароднай летняй школы, зладжанай універсітэтам Балоні (Beyong the Enlargement. The Wider Europe and the New Neighbourghood), у 2007–2008 нав.г. навучаліся ў магістратуры клагенфурцкага універсітэта (Master's of Science – Management of Protected Areas) і наведвалі летнюю школу, арганізаваную белградскім універсітэтам (The European Union and Legal Reform).

Падчас семінара дэманстраваліся слайды, на якіх у выглядзе колавых дыяграм адлюстроўвася ўдзел краін у выкананні сумесных праграм, падтрыманых CEI, – паказвалася, проста кажучы, як размяркаваўся фінансавы пірог паміж краінамі-ўдзельніцамі CEI. Як адзначыла Танія Пібернік, беларускі кавалак пакуль зусім маленькі, але гэта ўжо штосьці.

Кіраўніцтва БДУ (у асобе першага прарэктара Міхаіла Журaўкова) і Міністэрства замежных спраў краіны (у асобе дарадцы Галоўнага ўпраўлення Еўропы МЗС РБ Андрэя Кожана) заахвочвалі прысутных на семінары выкладчыкаў і прадстаўнікоў розных беларускіх ВНУ шукаць партнёраў ва Універсітэцкай сетцы CEI і смела браць удзел у стварэнні сумесных праграм.

Зацікаўленая ў далейшай інтэрнацыяналізацыі адукацыі ў Беларусі і Еўропа – дзякуючы спаваданай CEI студэнцкай і выкладчыцкай мабільнасці еўрапейцы спадзяюцца дачакацца нашых найлепшых кадраў на свае кафедры.

Больш даведацца пра Універсітэцкую сетку CEI, а таксама запоўніць заяўку на ўдзел у сумеснай праграме можна на сайце *www.ceinet.org*. Прадстаўнік сеткі ў БДУ – намеснік начальніка ўпраўлення міжнародных сувязяў Людміла Кацько.

**Падрыхтавала**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

УРАЧЫСТАСЦІ

# САЦЫЯЛОГІЯ БАЧЫЦЬ БУДУЧЫНЮ

**_Кафедра сацыялогіі ФФСН БДУ на сёння пакуль адзіная ў вышэйшай школе Беларусі, хоць сацыялогія адносіцца да адной з асноўных агульнаадукацыйных дысцыплін ва ўсіх ВНУ. І універсітэцкія сацыёлагі дапамагаюць у выкладанні гэтага прадмета._**



*Удзельнікі юбілейнай канферэнцыі*

Сацыялогія як навука, ды і сама згаданая кафедра, крыху старэйшыя, чым наша суверэнная дзяржава, аднак за такі кароткі час дасягнула значных вынікаў. Усе здабыткі сацыялагічнай навукі ў Беларусі падсумавалі на Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Сацыялагічная навука і адукацыя: стан, праблемы і перспектывы развіцця", прысвечанай 20-годдзю інстытуцыяналізацыі сацыялагічнай адукацыі ў нашай краіне, з удзелам вучоных з Расіі і краін Балтыі, якія жадалі падзяліцца з беларускімі калегамі сваім досведам у галіне сацыялогіі.

Член-карэспандэнт РАН і галоўны рэдактар маскоўскага часопіса "Сацыялагічныя даследаванні" прафесар Жан Тошчанка расказаў пра сучасны стан грамадскай свядомасці ў Расіі. Арвідас Матуліоніс, дырэктар Інстытута сацыяльных даследаванняў у Вільнюсе, ахарактарызаваў сацыялагічную навуку і адукацыю ў Літве. Па іх словах, сацыялагічнай навуцы ў суседніх з намі краінах надаецца вялікая ўвага. Гэта зразумела, бо сацыялогія можа і павінна даваць інфармацыю па магчымых выніках важных рашэнняў, якія прымаюцца на дзяржаўным узроўні; распрацоўваць навукова абгрунтаваныя прагнозы, якія рэальна адпавядаюць інтарэсам чалавека і скіраваныя на ўмацаванне стабільнасці грамадства. Адным словам, важнасць сацыялогіі, якая ўзрастае год ад году, заключаецца ў яе здольнасці бачыць будучыню. Паводле часопіса "Соцыус", у Расіі сёння працуе 35 факультэтаў па сацыялогіі, 25 аддзяленняў і 85 кафедраў, штогод выпускаецца да 8 тысяч сацыёлагаў, абараняецца не меней за 60 доктарскіх дысертацый, з'явілася больш як 10 сацыялагічных выданняў. У нашай краіне набыткі больш сціплыя: кафедра сацыялогіі, як ужо зазначалася вышэй, у нас адзіная, доктарская дысертацыя абараняецца адна ў два гады, а таксама 7–10 кандыдацкіх дысертацый у год. Часопісаў таксама небагата, толькі два: "Сацыялогія", які выдаецца 12 гадоў, і "Філасофія і сацыяльныя навукі". Аднак, на думку загадчыка кафедры сацыялогіі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара *Аляксандра Данілава*, узровень сацыялагічнай навукі ва ўніверсітэце і ў Беларусі даволі высокі. Па яго словах, за мінулыя два дзесяцігоддзі сфарміравалася эфектыўная, адэкватная часу сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў. Пра гэта сведчаць дасягненні былых студэнтаў факультэта філасофіі і сацыяльных навук і яго аддзялення сацыялогіі, якія працуюць у нашай краіне, блізкім і далёкім замежжы. Выкладчыкі кафедры распрацоўваюць новыя навуковыя кірункі. Іх, аўтарытэтных і прызнаных вучоных, запрашаюць на буйныя міжнародныя навуковыя форумы. Яны з'яўляюцца аўтарамі фундаментальных навуковых прац. На кафедры паспяхова працуе аспірантура і дактарантура. Актыўна ўсталёўваюцца навуковыя кантакты з калегамі з Расіі, Украіны, краін Балтыі, Польшчы, ЗША, Канады, Ізраіля, Сербіі, Германіі, Аўстрыі. Выкладчыкі, прафесары і дацэнты кафедры з'яўляюцца аўтарамі ўсіх падручнікаў па сацыялогіі, на аснове якіх вядзецца выкладанне ў айчынных ВНУ. Нездарма лаўрэатамі прэміі імя У.І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук сёлета сталі адразу чатыры прафесары кафедры сацыялогіі: доктар філасофскіх навук Альберт Елсукоў, доктар гістарычных навук Паўла Украінец, доктар філасофскіх навук Леанід Гуцаленка, доктар сацыялагічных навук Ларыса Цітарэнка, якія былі адзначаны за падрыхтоўку навучальнага дапаможніка для студэнтаў "Сацыялогія". Апошні, як і падручнік "Гісторыя сацыялогіі" пад рэдакцыяй А. Елсукова, вытрымаў ужо пяць выданняў і стаў класічным.

П. Украінец таксама нядаўна выдала цудоўны вучэбна-метадычны комплекс "Сацыялогія кіравання", з якога распачаўся выпуск серыі кніг пад рубрыкай "Кафедра сацыялогіі". Л. Цітарэнка завяршыла працу над дапаможнікам "Сацыялогія грамадскай думкі", які таксама рэкамендаваны да друку. Атрымалі прызнанне манаграфіі Л. Гуцаленкі "Сацыялогія канкурэнцыі" і "Чалавек: мера дабра і зла".

Нашы выкладчыкі памятаюць час, калі курсы лекцый чыталіся без падручнікаў і неабходнай літаратуры. Тады многае даводзілася рабіць упершыню. У 1989 г. у БДУ ўзнік філасофска-эканамічны факультэт у складзе трох аддзяленняў, адным з якіх і было аддзяленне сацыялогіі. Пасля стварэння самастойнага эканамічнага факультэта ў 1999 г. ФЭФ быў рэарганізаваны ў факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Нездарма юбіляры шмат добрых слоў адрасавалі Альберту Елсукову, які быў першым дэканам новага падраздзялення: менавіта пад яго кіраўніцтвам арганізоўвалася аддзяленне сацыялогіі і кафедра сацыялогіі ў верасні 1989 г. Альберт Мікалаевіч прыгадаў, што пры фарміраванні кафедры акцэнт зрабілі на кадры Праблемнай НДЛ сацыялагічных даследаванняў, якая доўгі час паспяхова працавала ва універсітэце. Пазней з павелічэннем аб'ёму вучэбнай нагрузкі да супрацоўніцтва запрасілі вядучых спецыялістаў з толькі што створанага Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі. Арганізавалася кафедра пад уплывам прызнанага лідара беларускай сацыялогіі прафесара Георгія Давідзюка. У 2003–2005 гг. яе паспяхова ўзначальваў прафесар Давід Ротман, сёння дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ. Надае важнае значэнне развіццю сацыялогіі на ФФСН і цяперашні яго дэкан – доктар сацыялагічных навук Анатоль Рубанаў.

Падчас канферэнцыі юбіляраў павіншавалі першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў, ганаровы дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі акадэмік Яўген Бабосаў, а таксама намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур. Усе ўдзельнікі мерапрыемства былі згодны, што варта сур'ёзна задумацца пра будучыню сацыялогіі ў БДУ. Важна ўмела паклапаціцца пра магутны навуковы патэнцыял, які створаны на адпаведнай кафедры. Трэба развівацца і арганізацыйна – адкрываць даследчыя лабараторыі і новыя кафедры, умацоўваць навуковыя кантакты, наладжваць студэнцкія, аспіранцкія абмены і г. д. Усё гэта павінна паслужыць добрым прыкладам для тых ВНУ, якія таксама рыхтуюць спецыялістаў па сацыялогіі.

**Ганна ЛАГУН**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ВЫСТАВЫ

# Hi-Tech экспансія БДУ

***Каля 50 навукова-тэхнічных распрацовак у розных галінах паказаў Беларускі дзяржаўны універсітэт 5–8 кастрычніка на Нацыянальнай выставе Рэспублікі Беларусь у Екацярынбургу (Расія).***



На нашым стэндзе дэманстраваліся рэчывы і тэхналогіі для металаапрацоўкі і машынабудавання; комплексы абсталявання для вытворчасці вырабаў з успененых поліурэтанаў; рэчывы і тэхналогіі для харчовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі; прыстасаванні, праграмныя комплексы медыцынскага прызначэння; абсталяванне і сістэмы для забеспячэння бяспекі на вытворчасці.

Дадзеная прадукцыя выпускаецца на вопытных вытворчасцях НДІ фізіка-хімічных праблем, НДІ прыкладных фізічных праблем, НДІ ядзерных праблем, Рэспубліканскага цэнтра праблем чалавека, а таксама ў РУП "Унітэхпрам БДУ".

Вялікую цікавасць у патэнцыйных спажыўцоў навукова-тэхнічнай прадукцыі універсітэта выклікалі:

– Тэхналогіі і рэагенты для ачысткі прамысловых сцёкавых вод;

– Дыягностыка дыхання з выкарыстаннем шматфункцыянальна-аўтаматызаванага спірометра МАС-1;

– Мікрахвалевая апрацоўка насення, сушка драўніны з выкарыстаннем мікрахвалевых тэхналогій;

– Тэрмаўстойлівыя клеявыя кампазіцыі, злучальныя ў керамічнай вытворчасці;

– Аўтаматызаваныя комплексы па вытворчасці вырабаў з пенаполіурэтанаў, ужыванне сарбенту "Пенапорум".

Па выніках перамоў падпісаны пратакол аб намерах у галіне распрацоўкі і ўкаранення тэхналогій ачысткі прамысловых сцёкавых вод паміж ААТ "НВА" (г. Екацярынбург, РФ) і НДІ ФХП БДУ (г. Мінск, РБ).

Дарэчы, у лістападзе БДУ возьме ўдзел ажно ў трох выставах:

1. 11-я Міжнародная спецыялізаваная выстава "Перспектыўныя тэхналогіі і сістэмы", г. Мінск, 17-20 лістапада;

2. Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Маскве (у межах VI Форума дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Масквы), УВЦ, 21-27 лістапада і выстава інавацыйных праектаў у будынку Урада Масквы на Новым Арбаце, 22-24 лістапада;

3. Нацыянальная экспазіцыя Рэспублікі Беларусь у г. Ашхабад (Туркменістан), у рамках Сельскагаспадарчага форума краін-удзельніц СНД, 24-27 лістапада.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення навукова-інавацыйнай дзейнасці**

З НАГОДЫ

# ПРАЦЯГ ПАСЛЯ ВАЙНЫ

***Гісторыі БДУ першага пасляваеннага пятнаццацігоддзя прысвечана кніга "Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1945-1961".***




Выданне прымеркавана да 88-годдзя альма-матэр. Раней пабачылі свет 2 кнігі пра БДУ, якія ахопліваюць перыяды з 1921 да 1945 гг. Заключная частка гэтай серыі кніг пра гісторыю універсітэта будзе ахопліваць 1961–1991 гг. і выйдзе да 90-годдзя БДУ, якое будзе адзначацца ў 2011 г.

У кнігу "Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1945–1961" уключаны афіцыйныя дакументы з дзяржаўных і асабістых архіваў і музеяў, а таксама ўспаміны выкладчыкаў і былых студэнтаў. Адной з важных крыніц стала шматтыражная газета БДУ з матэрыяламі пра самыя розныя кірункі дзейнасці універсітэта, нарысамі пра падзеі штодзённага жыцця.

У першым раздзеле "Аднаўленне" (1945–1953 гг.) гаворка ідзе пра падзеі, звязаныя з адраджэннем універсітэта пасля вайны: будаўніцтвам, фарміраваннем выкладчыцкага і студэнцкага складу, аднаўленнем навуковай дзейнасці, развіццём навукі.

Другі раздзел кнігі "Са спадзяваннем на лепшае" ахоплівае перыяд з 1954 да 1961 гг. Характэрнай асаблівасцю таго часу стала пацяпленне міжнароднага клімату і, як вынік, інтэнсіўныя замежныя стасункі студэнтаў і выкладчыкаў і БДУ ў цэлым. Важным фактарам, які спрыяў фарміраванню грамадзянскай пазіцыі моладзі, стаў удзел нашых студэнтаў у асваенні цалінных і абложных земляў. У гэты час удасканальвалася матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта, паляпшаліся побытавыя ўмовы жыцця студэнтаў, пашыралася тэматыка фундаментальных даследаванняў.

Трэці раздзел кнігі завецца "Мазаіка жыцця факультэтаў" (1945–1961) і гаворыць сам за сябе.

Укладальнікі выдання – дэкан гістарычнага факультэта дацэнт Сяргей Ходзін, прафесар Алег Яноўскі, а таксама выкладчык Міхаіл Шумейка.

Кніга выйшла ў серыі "Memoria et Gloria", якая прысвечана выбітным асобам БДУ і з'яўляецца данінай павагі тым, хто ўславіў альма-матэр у айчыннай і сусветнай навуцы, культуры і гісторыі.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

***"Золата" і дзве "бронзы" заваявалі першакурснікі БДУ на трэцяй міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы сярод школьнікаў і студэнтаў ва ўзросце ад 16 да 18 год, якая завяршылася 28 кастрычніка ў Тэгеране (Іран). У спаборніцтвах бралі ўдзел каманды з 20 краін свету.***

Залаты медаль выйграў студэнт фізічнага факультэта Уладзімір Харошка, які скончыў сёлета сталічную гімназію № 29, бронзавыя медалі ў яго аднакурсніка Рамана Самусевіча, выпускніка Ліцэя БДУ гэтага года, і студэнта ФПМІ Дзмітрыя Емяльянава, выпускніка ліцэя № 1 г. Мінска. Дарэчы, гэтыя хлопцы паступілі ў гэтым годзе ў вядучую ВНУ нашай краіны без экзаменаў як пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па астраноміі сярод школьнікаў.

***

***Перамогай жаночай студэнцкай зборнай каманды Беларусі завяршылася 1 лістапада восеньская серыя гульняў у тэлевізійным клубе знаўцаў "Што? Дзе? Калі?".***

У складзе каманды-пераможцы адзначыліся і прадстаўніцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта: капітан каманды студэнтка Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Алёна Повышава, студэнтка факультэта журналістыкі Алена Шыбут, а таксама выпускніца юрыдычнага факультэта Аляксандра Татарынава.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, экалагічнага і аграрнага права, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, фізічнай электронікі, функцыянальнага аналізу, лікавых метадаў і праграмавання, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных, вылічальнай матэматыкі, матэматычнага забеспячэння АСК, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў СНД, гісторыі Расіі, дыпламатычнай і консульскай службы, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, літаратурна-мастацкай крытыкі, паліталогіі, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, грамадзянскага працэсу і працоўнага права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, матэматычнага забеспячэння АСК, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, літаратурна-мастацкай крытыкі, сацыялогіі журналістыкі, канстытуцыйнага права;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Расіі, міжнароднага права, сацыялогіі журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, тэхналогій камунікацыі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, канстытуцыйнага права;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння АСК, тэарэтычнай і прыкладной механікі, тэорыі функцый, ураўненняў матэматычнай фізікі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

**НДІ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ БДУ**
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

– МАЛОДШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.01 (фізічная электроніка);

– НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.17.16 (прыстасаванні і метады эксперыментальнай фізікі);

– МАЛОДШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.13.11 (тэхналогія і перапрацоўка палімераў і кампазітаў).

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ**
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

– ЗАГАДЧЫКА кафедры эканомікі і кіравання вышэйшай школы – 1;

– ДАЦЭНТА кафедры псіхалогіі і педагагічнага майстэрства – 1;

– ДАЦЭНТА кафедры філасофіі і метадалогіі універсітэцкай адукацыі – 1;

– СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры сучаснага прыродазнаўства – 1;

– ВЫКЛАДЧЫКА кафедры філасофіі і метадалогіі універсітэцкай адукацыі – 0,75.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215, тэл. 200-91-07.

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Будаўніцтва інтэрната БДУ ў студэнцкай вёсцы** – naviny.by (07.11).

**Дні беларускай культуры на філалагічным факультэце БДУ** – БелТА (07.11); "Знамя юности" (09.11); "Минск-новости" (09.11).

**Сродак экспрэс-дыягностыкі вірусных інфекцый, распрацаваны вучонымі БДУ і НАН,** – "Рэспубліка" (03.11).

**Гутарка з дэканам эканамічнага факультэта М. Кавалёвым накont сусветнага фінансавага крызісу** – "Звязда" (03.11).

**Запрашэнне на фестываль БДУ "Такие пряники"** – БелаПАН (02.11).

**Рэпетыцыйнае тэсціраванне ў Інстытуце бесперапыннай адукацыі БДУ** – interfax.by (01.11).

**Узнагароды студэнтам БДУ на міжнароднай алімпіядзе па астраноміі** – БелТА (28.10); "Минск-новости" (30.10); "Вечерний Минск" (06.11).

**Святочныя мерапрыемствы да Дня нараджэння БДУ** – naviny.by (27.10); "Минский курьер" (30.10); date.by (27.10); np.by (27.10); 21.by (27.10).

**Семінар "Мадэрнізацыя і ўкараненне бізнэс-адукацыйных праграм для падрыхтоўкі спецыялістаў у турыстычнай індустрыі Беларусі"** – БелаПАН (26.10); open.by (26.10); "Настаўніцкая газета" (29.10).

**Прысуджэнне прэмій імя У.Пічэты і А.Сеўчанкі** – "Минск-новости" (23.10); "Вечерний Минск" (04.11); date.by (27.10); np.by (27.10); 21.by (27.10).

**Падрыхтоўка кадраў для АЭС** – interfax.by (23.10).

**Пра аддзел гуманітарна-асветніцкай работы Фундаментальнай бібліятэкі БДУ** – "Літаратура і мастацтва" (23.10).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

**ІНСТЫТУТ БІЗНЭСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ**
ЗАПРАШАЕ
студэнтаў 4-5 курсаў
і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй
**на перападрыхтоўку**
па наступных спецыяльнасцях:
**Інавацыйны менеджмент;**
**Інвестыцыйны менеджмент.**

Выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору і прысвойваецца кваліфікацыя "менеджэр-эканаміст".

Форма навучання – вячэрняя

Навучанне платнае, студэнтам БДУ – істотныя зніжкі

Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 731
Тэл.: +375 (17) 259-70-71
*www.sbmt.by*

**ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**
**ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ**
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР
слухачоў з няпрофільнай
вышэйшай адукацыяй
**на перападрыхтоўку па спецыяльнасці**
**"Сродкі масавай інфармацыі"**
(2 гады завочнай формы навучання)
Навучанне платнае
Залічэнне па выніках сумоўя
Па заканчэнні навучання выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору з прысваеннем кваліфікацыі "Журналіст"
Дакументы прымаюцца да 20.01. 2010 г.
Тэл./факс: 259-70-16, 259-70-72, 259-70-15
*http://www.journ.bsu.by*
*e-mail: jorn_fpk@bsu.by*

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# ПАЛЕМІКА НА КАРЫСЦЬ

***"Актыўная грамадзянская пазіцыя – важны складнік моладзевай культуры", – адзначыла на нядаўняй канферэнцыі па пытаннях вышэйшай адукацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы акадэмік РАА Ірына Зімняя. Нібыта ў пацвярджэнне яе слоў у нашай ВНУ ўзнікла студэнцкая суполка Дыскусійна-палітычны клуб пры БРСМ БДУ. Мы вучыліся быць годнымі лідарамі – зараз мы навучымся быць здольнымі палітыкамі.***



*Удзельнікі студэнцкага дыскусійна-палітычнага клуба на экскурсіі ў будынку парламента*

16 кастрычніка адбылося першае пасяджэнне студэнцкага дыскусійна-палітычнага клуба "ГОЛАС". У сваёй дзейнасці клуб імкнецца выхоўваць у студэнтаў БДУ патрыятызм як найважнейшую духоўную і сацыяльную каштоўнасць; інфармаваць іх пра дзейнасць органаў дзяржаўнай улады, а таксама пра асноўныя кірункі знешняй і ўнутранай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

"Мэтай дзейнасці клуба з'яўляецца прыцягненне студэнтаў у сацыяльна-палітычныя працэсы краіны, садзейнічанне развіццю ў Беларусі грамадзянскай супольнасці, заснаванай на духоўна-маральных каштоўнасцях беларускага народа. Для ажыццяўлення сваіх мэт і задач студэнцкі дыскусійны клуб арганізуе сустрэчы, круглыя сталы і канферэнцыі з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і Мінскага гарадскога савета дэпутатаў, кіраўнікоў органаў дзяржкіравання рознага ўзроўню, лідараў грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый патрыятычнай скіраванасці. Такім чынам мы дапамагаем моладзі адаптавацца ў грамадска-палітычным асяроддзі", – зазначыў арганізатар ДПК Мікалай Валовіч.

Акрамя гэтага ў кола мерапрыемстваў клуба ўваходзіць правядзенне выбараў сакратароў БРСМ на факультэтах і ва універсітэце. Дзверы клуба адчыненыя для ўсіх ахвотных.

Звяртайцеся на адрас: прасп. Незалежнасці, 4, к. 202, тэл. (8-029) 683-16-8; *e-mail: Nikolaj_Volovich@tut.by*

**Надзея КУХАРЧЫК**

ВІНШУЕМ!

**Жаночая каманда па футболе "Зорка-БДУ" заваявала Кубак Беларусі – самы значны трафей у сваёй калекцыі дасягненняў. У фінале турніру на полі САК "Алімпійскі" яна адолела "Бабруйчанку" з лікам 2:0. Нагадаем, гульцы каманды з'яўляюцца спартсменкамі-інструктарамі Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі БДУ.**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

9 лістапада ў ВСК "Універсітэцкі" прайшлі спаборніцтвы па армрэстлінгу ў межах Спартакіяды інтэрнатаў Студэнцкага гарадка БДУ. Таксама ў гэты дзень у інтэрнаце № 2 адбыліся спаборніцтвы па настольным тэнісе на "Кубак дырэкцыі" ў рамках праграмы "Інтэрнатаўскія спрэчкі".

***

Студэнцкая відэастудыя "SVS" падрыхтавала чарговыя інфармацыйныя выпускі навін, у якіх асвяціла такія мерапрыемствы, як выязны адукацыйны семінар для старастаў вучэбных груп першага курса, "Ты стараста!", закрыццё 3-га Працоўнага семестра, перапіс насельніцтва, а таксама традыцыйны "Кулінарны конкурс" Студгарадка. Паглядзець навіны можна на сайце *www.studgorodok.bsu.by*, а таксама на старонцы *http://intranet.bsu.*

***

18 лістапада ў канферэнц-зале інтэрната № 2 псіхалагічная служба БДУ сумесна з Цэнтрам педагагічных тэхналогій зладзіць для педагагічных работнікаў інтэрнатаў семінар-трэнінг па псіхалагічнай падрыхтоўцы.

АКТУАЛЬНА!

# ЭПІДЭМІЯ ГРЫПУ? БЕЗ ПАНІКІ!

***Сёння, мабыць, усе ведаюць пра тое, чаго засцерагацца падчас уздыму актыўнасці вірусных інфекцый. Эпідэміі грыпу здараюцца кожны год звычайна ў халодную пару і паражаюць да 15% насельніцтва Зямлі. Грып і ВРІ (вострая рэспіраторная інфекцыя) складаюць 95% ад усіх інфекцыйных захворванняў у свеце. У нашай краіне гэты вораг нябачнага фронту "пасяліўся" яшчэ ў кастрычніку, а на пазамінулым тыдні сітуацыя з грыпам была абвешчана эпідэміялагічнай.***



Як вядома, ворага трэба ведаць у твар. *Святлана Ефімоўская*, загадчыца здароўпункта БДУ, яго апісала. Слабасць, сустаўныя і мышачныя болі, галаўны боль, хваравіты кашаль, насмарк, павышаная тэмпература – такія сімптомы грыпу. Нярэдка да іх прымешваецца паражэнне страўнікава-кішачнага тракту – вынік інтаксікацыі. Дарэчы, вірус ВРІ – нязменны папярэднік грыпу. Таму вельмі важна пачаць лячэнне пры першых прыкметах гэтых прастудных захворванняў. Звярнуўшыся ў здароўпункты БДУ, размешчаныя па вул. Бабруйская, 9 (каб. 103) і вул. Курчатава, 6, студэнты могуць атрымаць даведку з вызваленнем ад заняткаў тэрмінам на 5 дзён. Калі за гэты час хвароба не пройдзе, то ўчастковы тэрапеўт у студэнцкай паліклініцы падоўжыць тэрмін дзеяння даведкі, а студэнтам з Мінска прыйдзецца адкрываць новую.

З тэмпературай 38, а тым больш 39 градусаў, абавязкова трэба выклікаць урача. І не толькі таму, што для здаровых людзей існуе небяспека заражэння. Да прыходу ўрача рэкамендуецца піць вялікую колькасць



*Трохмерная мадэль віруса A/H1N1*

вадкасці, можа палегчыць стан хворага тэрафлю, ібуклін, німісіл, фервекс. Тым не менш, самалячэнне грыпу недапушчальнае, бо прадбачыць рух хваробы немагчыма. Такое ўскладненне, як вострая пнеўманія, нярэдка развіваецца з першых жа дзён, а часам і з першых гадзін захворвання на грып. Хворыя на грып патрабуюць пастаяннага назірання з боку медпрацаўнікоў, але, на жаль, каля 30% хворых звяртаюцца ў стацыянары позна – пасля 5-6 дзён захворвання, што і прыводзіць да залежнай плыні пнеўманіі і іншых ускладненняў.

Па запэўненнях медыкаў, найбольш эфектыўным сродкам прафілактыкі ад грыпу можна лічыць вакцынацыю. Існуе памылковае меркаванне, што пасля пачатку эпідэміі вакцынацыя супрацьпаказаная. Тым не менш, калі з нейкіх прычын вакцынацыя не была зроблена своечасова, гэта можна ажыццявіць і пасля пачатку эпідэміі грыпу. Добрая навіна для студэнтаў: у здароўпунктах БДУ і студэнцкай паліклініцы можна бясплатна зрабіць выратавальную прышчэпку з гатовымі антыцеламі.

Вірус грыпу вельмі лёгка перадаецца. Самы распаўсюджаны шлях перадачы інфекцыі – паветрана-крапельны. Таксама магчымы і пабытавы шлях перадачы, напрыклад, праз прадметы ўжытку. Для таго, каб не дазволіць хваробе ўзяць верх над імунітэтам, неабходна прытрымлівацца прафілактыкі: частае праветрыванне, вільготная ўборка, таксама варта ўстрымацца ад наведвання масавых мерапрыемстваў, часцей мыць рукі. Досыць дзейсныя супрацьвірусныя сродкі – арпетол, інтэрферон, рэмантадзін, аксалінавая мазь. Дадаткова неабходна прымаць аскарбінавую кіслату і полівітаміны, якія спрыяюць павышэнню супраціўляльнасці арганізма.

Дарэчы, зараз вельмі папулярныя медыцынскія маскі не прызначаны для поўнай абароны ад мікраарганізмаў. Вірусы грыпу занадта дробныя і таму з лёгкасцю пройдуць праз тканіну. Гэтыя маскі патрэбны толькі для таго, каб стрымліваць буйныя аэразольныя часціцы. Медыкі раяць надзяваць іх на хворых, мяняць праз кожныя дзве-тры гадзіны. Даволі часта можна сустрэць на вуліцах горада, у грамадскім транспарце людзей у такіх масках, але ж спадзявацца толькі на іх – самападман. Нашэнне падобных павязак становіцца ледзь не модай. "Гэта так званы "эфект заражэння" паводзінамі, – растлумачыў начальнік псіхалагічнай службы БДУ *Руслан Папок*. – Такім чынам людзі панікуюць, на падсвядомым узроўні спрабуюць зняць кантроль над сітуацыяй і перакласці яго на іншых. Без дзейсных захадаў па прафілактыцы і барацьбы з вірусам маскі толькі падтрымліваюць ілюзію клопату пра сваё здароўе". Аднак перастаць панікаваць і махнуць на хваробу рукой – не адно і тое ж. Медыкі заклікаюць не ленавацца, калі гаворка ідзе пра здароўе.

**Вера ГРАМЧАКОВА**
**Кіра КІРСАНАВА**

### У ПРЫДАЧУ

Па звестках Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, у нашай краіне на 10 лістапада зарэгістравана 128 выпадкаў захворвання на грып A/H1N1 на фоне ўсіх вірусаў, якія на сёння лабараторна пацверджаны ў хворых. "Свіны грып" вінаваты ў сямі смярцях ад пнеўманіі (да прыкладу, колькасць памерлых ад наступстваў грыпу і ВРВІ ва Украіне ўзрасла да 155 асоб, а ў Расіі лабараторна пацверджана 4 563 выпадкі заражэння гэтым вірусам па краіне. Памёр ад грыпу A/H1N1 21 чалавек). Аднак, па словах намесніка міністра аховы здароўя, галоўнага санітарнага ўрача Беларусі Валянціны Качан, за апошнія дні назіраецца паніжэнне колькасці зваротаў грамадзян з нагоды захворванняў на грып і ВРВІ дзесьці ад 4 да 25% у розных населеных пунктах. 5 лістапада было зарэгістравана 10198 хворых на ВРВІ (7474) і грып (2724), з іх шпіталізавана 175 чалавек, а 7 лістапада дыягназ ВРВІ або грып быў зафіксаваны ў 4288 чалавек (3084 і 1204). Шпіталізавана – 150. Разам з тым у асобных рэгіёнах сітуацыя застаецца пакуль напружанай. Прынамсі, на сёння асаблівая сітуацыя складаецца ў Мінску, але яна кантралюецца.

Нагадаем, з 6 лістапада ў Мінску ўведзеныя "дадатковыя супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы", па 11 лістапада ўключна падоўжаныя школьныя канікулы.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

16 лістапада 2009 года
Падпісана да друку 12.11.2009 г.
Зак. 1146. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***